простоте заставило покинуть шнуровку, сузить, на сколько возможно, юбку, уничтожить рукава и подпоясывать талию под самой грудью. Поверх легкого античного платья надевали меховую шубку, куафюры приняли античный вид. Талия поднялась так высоко, что непосредственно от нее открывался шейный ворот, от этого короткого лифа шла узкая юбка. Наконец, убедившись в невозможности носить такие одежды, снова вернулись к корсету.

Позже мода была не менее подвержена изменениям почти каждое пятилетие. Вопрос о целесообразности и удобстве одежды французского двора оставался в стороне. Французский костюм 18-19 веков ставил задачей показать роскошь и богатство французской аристократии.

## МЕСЦА І РОЛЯ БЕЛАРУСІ Ў ПОЛЬСКІМ ПЫТАННІ Ў ПЕРЫЯД ВАЙНЫ 1812 г.


***Т.П. Сіліванюк***

Навуковы кіраўнік – к.ф.н., дацэнт ***Н.П. Галімава***

*Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна*


Польскае пытанне ўзнікае на гарызонце гісторыі пасля падзелаў РП. Амаль адразу пасля гэтай падзеі на зямлях, якія ўваходзілі ў склад былой РП, узнікаюць ідэі аб аднаўленні незалежнасці сваёй краіны. Польскі нацыянальны рух у светлым будучым бачыў аднаўленне РП у межах да падзелу 1772 г., а паколькі састаўной часткай гэтай дзяржавы акрамя Кароны Польскай з'яўлялася ВКЛ, то ў перспектыве адроджаная Польшча бачыла падпарадкаванне ёй былога ВКЛ. Таму адным з асноўных накірункаў палітыкі расійскага ўрада стала ўключэнне тэрыторыі і насельніцтва далучанных зямель у адзіны імперскі арганізм.

На беларуска-літоўскіх землях магчымая самастойнасць Польшчы ўспрымалася як надзея на незалежнасць гэтых зямель, таму ўсялякі заклік да свабоды Польшчы знаходзіў спачуванне сярод беларуска-літоўскіх элементаў. У час вайны 1812 г., польскае пытанне займае значнае месца ў міжнароднай палітыке. Любы з ваюючых бакоў разглядаў тэрыторыі беларуска-літоўскіх зямель як стратэгічны аб'ект, плацдарм для вядзення баявых дзеянняў.

У 1807 г. Напалеон і Аляксандр I дамовіліся ў Тыльзіце аб стварэнні Варшаўскага княства, а ў 1812 г., як вядома, апошняе далучылася да французскага імператара і падтрымала яго. 28 чэрвеня 1812 г. Варшаўскі сейм аб'явіў аб стварэнні Генеральнай канфедэрацыі, якая прыняла «Акт аднаўлення Каралеўства Польскага». 11 ліпеня таго ж года акт быў прадстаўлены Напалеону, але ён не падпісаў дакумент, гаворачы аб складанасці гэтага пытання. 1 ліпеня французскі імператар дае загад аб арганізацыі ўлады ў Літве, такім чынам абвяшчаючы аб аднаўленні ВКЛ. У Вільні ўтвараецца Часовы ўрад пад назвай «Камісія ВКЛ». Дзейнасць Камісіі распаўсюджвалася на Віленскую, Гродзенскую, Мінскую губерні і Беластоцкую вобласць.14 ліпеня ў Вільні Камісіяй ВКЛ быў прыняты акт аб далучэнні да Генеральнай канфедэрацыі. Па сутнасці адбылося далучэнне ВКЛ да Польшчы. Трэба таксама дадаць, што над Часовым урадам існаваў пастаянны кантроль, які ажыццяўляў прызначаны Напалеонам камісар Біньон. У кіраванні цэнтральнымі і мясцовымі органамі ўлады побач з мясцовымі чыноўнікамі актыўны ўдзел прымалі і французы. Вось такім прадстае прад намі адроджаннае французамі ВКЛ.

У свой час выкарыстаць у асабістых інтарэсах польскае пытанне паспрабаваў і Аляксандр I. М.К. Агінскім быў прапанаваны праект адраджэння ВКЛ. Думку аб узнаўленні ВКЛ цар выказаў у размове з А.Чартарыйскім яшчэ ў 1809 г. (да месца адзначыць, што існаваў і т.зв. план Чартарыйскага: аднаўленне РП пад пратэктаратам расійскага імператара). Аднак на працягу 1810 г. Аляксандр I разлічваў падпарадкаваць свайму ўплыву Варшаўскае княства. Правал гэтай ідэі прывёў да звароту цара да прапановы Агінскага. Апошні ў маі 1811 у выглядзе запіскі выкладае свой праект, асноўнай ідэяй якога было стварэнне асобнай правінцыі пад назвай ВКЛ і пад кіраваннем расійскага імператарскага намесніка, а таксама прадугледжвалася ліквідацыя на працягу 10 гадоў прыгоннай залежнасці сялян. Выпрацоўка і абмеркаванне плана выклікала гучны рэзананс у расійскім грамадстве («Запіска пра старажытную і новую Расію» М. Карамзіна), у выніку чаго гэты план не быў зацверджаны.